УДК 398.85:355(476)

**Л. М. Луц**
*Бабруйскі філіял установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт», Бабруйск*

## МАСТАЦКАЯ ВЫХАВАЎЧАЯ СКІРАВАНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ КАЗАЦКІХ, РЭКРУЦКІХ І САЛДАЦКІХ ПЕСЕНЬ

**Уводзіны.** Педагагічны геній народа, яго светапогляд, маральна-этычныя ідэалы, жыццёвы вопыт, адносіны да дабра і зла даволі выразна праяўляліся ў фальклорных творах, якія ў сваю чаргу заўсёды з'яўляліся тымі крыніцамі, адкуль чэрпаюць і па чым вывяраюць свае ідэі лепшыя прадстаўнікі чалавецтва. Вывучэнне генезісу і эвалюцыі педагагічнай думкі беларускага народа праз песенную творчасць дае падставы сцвярджаць, што пры ўсёй разнастайнасці яе кірункаў самае велічнае і пачэснае месца займае яна ў справе выхавання, і асабліва маральнага. У айчыннай навуцы адсутнічаюць даследаванні, якія б разглядалі казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні ў ракурсе маральна-выхаваўчага патэнцыялу фальклора.

У казацкай, рэкруцкай і салдацкай творчасці вызначальнай заўсёды была функцыянальная размежаванасць дзвюх сфер, абумоўленая асаблівасцямі іх паўсядзённага ўкладу і ваенным жыццём. Дадзеныя беларускія песні сямейна-бытавой і сацыяльна-бытавой скіраванасці (песні «ўнутранага» бытавання) акцэнтавалі ўвагу на маральна-этычных і псіхалагічна-эмацыянальных перажываннях герояў. Значнае месца ў гэтых песнях удзяляецца духоўным перажыванням і памкненням чалавека, разважанням аб чалавечых узаемаадносінах.

**Асноўная частка.** Сваё жыццё казак (рэкрут, салдат) увасабляў у паняцце «адным днём», не прывязваючыся да адзінай дзяўчыны, сям'і. Ён знаходзіць сабе часовае кароткае каханне ў бясконцых пошуках шчасця з пункту гледжання яго эгаістычных інтарэсаў. Упэўнены ў сваёй беспакаранасці і прыгажосці, казак часта здзяйсняе негатыўныя ўчынкі, парушаючы ўсялякія маральныя прынцыпы. Ён хлусіць, падманвае дзяўчат, якія сустракаюцца на ягоным шляху: «Пасцель я пасцялю, сама я не лягу — / Казак маладзенькі адразу абмане. / Дзяўчынанька дурна пасцельку паслала — / Казак пажартаваў, дзяўчына не ўчула.<…>— Дзяўчына, дзяўчына, на сто рублёў на мыла, / Півам напівайся, мылам намывайся, / Каб краса зайграла, каб матка не пазнала» [1, с. 221]. Песні зафіксавалі шмат прыкладаў казацкага падману: «Бадай ты, казача, / Туды не даехаў, / Як ты мяне кінуў / Людзям на пацеху. / Туды не даехаў, / Назад не вярнуўся, / Як мне, маладзенькай, / Ўвесь свет зацягнуўся» [2, с. 124]. Беспрынцыповыя і антымаральныя дзеянні здзяйсняюць казакі, схіляючы дзяўчат да ўцёкаў з дому: «П'юць казакі і гуляюць, / К сабе Касю намаўляюць: / — Едзьма, едзьма, Кася, з намі, / Едзьма з намі, казакамі» [3, с. 298—299]. Бясхмарнае,

© Луц Л. М., 2016



Репозиторий БарГУ

шчаслівае жыццё, якое абяцалі казакі («Ды ў нас поле грашаўное, / Ды ў нас рэчкі медавыя, / Ды ў нас беражкі залатыя!» [4]), становіцца для дзяўчыны эмацыянальна-псіхалагічнай трагедыяй («Ты дзяўчына, ты дурная, / Чаму ж таго не сазнала, / Што ў нас поле камяное, / А рэчачкі крывяныя, / А масточкі трупяныя!»), ці нават прыводзяць да смерці («Як павязлі дзеўку гарамі-лясамі, / Прычапілі дзеўку да сасны касамі, / Падпалілі сосну з верху аж да нізу» [5]; «А кінулі дзяўчыначку / У Дунай глыбокі, у Дунай глыбокі» [6]). Маральна-этычныя нормы, якія адлюстраваны ў песнях, з'яўляліся асновай духоўнага здароўя, рэгулятарам у сямейных і грамадскіх адносінах: «А хто дачок маіць, няхай навучаіць — / З паўночы да ночы гуляць не пускаіць» [7]. З-за неразборлівасці ў любоўных сувязях казак (рэкрут, салдат) часта трапляе ў розныя ганебныя сітуацыі: «Яшчэ ж мяне бог сцярог, / Што з сястрою спаць не лёг» [8]. Казак часам нават прапаноўвае замужняй маладой жанчыне забіць яе мужа: «Дівчинонька моя люба, / Отхилися од нелюба. / Отхилися одъ нелюба, / Забью ёго як голуба» [9, с. 4]. Істотны маральна-выхаваўчы патэнцыял нясуць у сабе гэтыя песенныя прыклады, у першую чаргу папярэджваючы і перасцерагаючы слухача.

Цяга да стварэння сям'і закладзена ў псіхалогію чалавека самой прыродай. Няма чалавека, якога б не палохала перспектыва адзінокай старасці. Бессямейнасць, самота нараджалі скруху, унутраны дыскамфорт. Атаман традыцыйна раіў казаку: «Не трэба, казача, / Дамоў вандраваці, — / Няўжо ты не можаш / На іншых сказаці?» [10]. Аднак былі часіны, калі сумленне і жаданне маральна аднавіцца пераважалі: «Няможна, паночку, — / Хароша дзяўчына: / Радзіла сыночка / Праз маю прычыну» [11], і казак (рэкрут, салдат) адчуваў глыбокую патрэбу ў стварэнні нармальнай сям'і: «Дзяўчына-маліна, / Гадуй майго сына. / З вайны павярнуся, / З табой ажанюся» [12]. Вобраз казака (воіна) асацыіруецца з мужным чалавекам, здольным зрабіць немагчымае. Калі дзяўчына пасылае казака за «трузеллем», ён адказвае: «Адным канём да мора даеду, / Другім канём мора пераеду, / Трэцім канём трузелле дастану» [13, с. 220]. Але здраду, непавагу і падман у адносінах да сябе казак катэгарычна не прымае: «Ой, так ціха дуброва шумела, дуброва шумела, / Цішэй Марысі галоўка зляцела» [14]. І расправы салдатаў з нявернымі жонкамі часта заканчваліся забойствамі: «Прасци, сынъ жану! / — Я, матушка, ўсим пращаю, / Жаніе — никогда! / Махнулася шабля / Магучай рукой / Пакацилася галоўка / Жъ жаны маладой, / Астаўся мальчышка / Навіек сиратой» [15, с. 130—131]; «Зляцела галоўка нявернай жаны, эх!» [16, с. 433].

Найбольш драматычным у рэкруцкіх (салдацкіх) песнях з'яўляецца момант аб'яўлення набору. Трэба адзначыць, што ва ўзаемаадносінах улад і грамадства меў месца канфлікт паміж ваенна-мабілізацыйнай дзейнасцю дзяржавы і імкненнем насельніцтва ўхіліцца ад яе або палегчыць цяжар рэкруцкай павіннасці. Маладых людзей, якія хацелі схавацца ад набору, лавілі, як звяроў, нярэдка закоўвалі ў калодкі: «Як рэкруціка лавілі, / Назад ручкі павязалі, / Рэзвы ножкі акавалі» [17]; «Рукі мне назад скруцілі, / На ногі калодкі набілі» [18]. У некаторых песнях адзначаецца нават гвалтаванне і маёмасныя страты: «Яны дзверы паламалі, / Добра малайца спаймалі» [19]. Тут тыпова народная манера «хавання» ад ліха, ад любой бяды, якая магла адначасова ўспрымацца і як усеагульнае сацыяльнае гора, і як асабістая трагедыя бяспраўнага чалавека, — збегчы, схавацца: «Я й набору, хлопчык, не баюся, / Я ў лясочку пад куст схаранюся, / Злыя людзі малойца ўказалі. / Узялі, узялі малойца, звязалі…» [20, с. 345]. У маральным выхаванні рэкруцкія песні актыўна выкарыстоўвалі метад прыкладу. Ёсць песні, у якіх гаворыцца пра маці, якая не шкадуе аб тым, што сына забіраюць у рэкруты, бо ён п'яніца, гуляе дзень і ноч, не бывае дома, не дапамагае па гаспадарцы: «Парадзіла бедна ўдава салдацкага сына… / Запісала ўся грамада ў рэкруты аддаці. / — Няхай беруць, няхай пішуць тую п'янічэньку, / Штодзень піе, ноч гуляе, дома не бывае» [21].

У якасці ўзораў для пераймання выступалі песні, якія адлюстроўвалі сувязь аздобы рэкруцкага адзення на провады з нябеснымі свяціламі: «Я каўнер вышывала / Свайму большаму брату. / Па дарогах хадзіці, / Гасудару служыці. / У каўнярочку вышыла / А я жаркае сонца. / У рукавочку вышыла / А я ясён месячык. / У падалочку вышыла / А я дробныя звёзды» [22, с. 610]. Суаднесенасць касмічных аб'ектаў і асобных частак цела чалавека выяўляецца ў матыве агароджвання чалавека ад бяды і смерці.

Невыпадкова, што крытэрыем маральнасці асобы з'яўляецца не проста наяўнасць пэўнай сукупнасці адпаведных рыс і якасцей, а рэальныя дзеянні, учынкі і паводзіны чалавека. Так, пры развітанні казака (салдата) з маці, тая прамаўляла яму, што не словы, імкненні, намеры, эмацыянальныя адносіны, а канкрэтныя справы павінны вызначаць маральную годнасць чалавека, і выказвала пажаданне (наказ): «Служы вераю і праўдаю, / Трымайся за веру хрысціянскую / І слухай ўлад, суддзяў міласцівых, / Камандзіраў, афіцэраў / І радавых салдатаў. / Будуць суддзі, улады міласцівыя, / І сэрцы іх будуць жаласлівыя» [23].

Маральны ідэал уяўляў сабой шматбакова развітую дабрачынную, цнатлівую асобу з высокім узроўнем духоўнасці. Цікава адзначыць, што побач з такімі агульнапрынятымі маральнымі якасцямі, як добразычлівасць, міласэрнасць, памяркоўнасць, разважлівасць, цярплівасць, паслухмянасць, акцэнтавалася ўвага і на пачуцці ўласнай годнасці: «А будзь жа ты ды умён-разумён, гэй! / Гэту службачку ты верненька служы, гэй!» [24, с. 58]; «Не будзь, сынку, ні грубён, ні слушон, / Да будзь, сынку, ўсяму свету наравён»; «Свае сынкі навучаючы: / — Гасудару прымнюсенькі, / Ўсяму свету пакарнюсенькі» [25].

У час існавання рэкруцкай павіннасці да «салдацкага саслоўя», ці «ваеннага», адносіліся жонкі і дзеці рэкрутаў. Вобраз беларускай рэкруткі (салдаткі), яе жыццёвыя цяжкасці, праблемы, спадзяванні, адчай, горыч, пошукі выйсця, часам негатыўныя, нават амаральныя, паводзіны праявіліся ў шматлікіх беларускіх рэкруцкіх і салдацкіх песнях.

Часта лёс рэкрутавай жонкі лічыўся горшым, чым лёс удавы. Апошняя магла другі раз выйсці замуж, а салдатку чакала адзіноцтва і пакуты. Рэпутацыя салдаткі ў грамадстве была часцей дрэннай. Атрымаўшы нібыта «свабоду» ад мужа, не кожная жанчына магла разумна распараджацца ёю. Часам яна распускалася і пачынала жыццё, не абмежаванае ніякімі маральна-этычнымі прынцыпамі: «Муой мужъ на вайне, / Шабля на калуочку, / Ой, хто жъ мяне пацалуя, — / Пашыю саруочку!» [26]; «А ў новых дамах жыльцы будуць, / У маладых жонак мужы будуць, / У дробных дзетак бацькі ня будзіць» [27]. У песнях адлюстраваліся выпадкі, калі жанчына, будучы ў шлюбе

Рэпазіторый БарДУ

з рэкрутам, нараджала дзіця пасля яго адыходу ў войска: «Жана маладая закон змяніла, эх! / Ад чужога мужа сына радзіла, сына радзіла» [28]. Некаторыя жанчыны пачыналі, атрымліваючы «свабоду» ад мужа, разгульна-амаральнае жыццё: «Дзъетушкамъ дробнымъ бацьки ня будзиць, / Жонам молодымъ мужья будуць, / Дзъетушкамъ дробнымъ бацьки ня будзиць, / Жоны молодыя, пьюць, гуляюць, / Дзътушки дробныя слезы уцираюць, / Жоны молодыя по застолью, / Дзъетушки дробныя по зауголлью» [29, с. 667]. На пытанне мужа «як ты без мене жыла?», жонка, бывала, адказвала: «Ой, жылось мне харашо, пайдзі паслужы яшчо!» [30]. У зборніку «Жанчына ў беларускай народнай творчасці» так гаворыцца аб жанчыне, якая нарадзіла дзіця без бацькі: «…такую жанчыну зневажалі, і дзіця не мела і імя людскага і нічога. Яго не дапускалі нікуды, хоць ён быў у вялікіх гадах. І хадзілі дзеці гэтыя па вёсках, жабравалі, павадырамі былі ў сляпых» [31, с. 95].

У рэкруцкіх (салдацкіх) песнях адлюстраваны негатыўныя адносіны свекрыві да нявесткі, асабліва тады, калі сын з пахода прыязджае і «вязе сабе чужаземачку, за жоначку». Маці так не жадае прыняць у сям'ю маладую жанчыну і не згодная з выбарам сына, што вырашае загубіць дзяўчыну: «Выйшла маці яго прыняці, / Не так прыняці, як атраўляці. / Вынесла сынку краснага вінца, / А нявестачцы белай атруты. / А сынок віно пад каня выліў, / Белую атруту папалам выпіў» [32, с. 16—17]. Рэўнасць маці да адзінага сына прыводзіць да трагедыі. Гэты баладны матыў у рэкруцкіх і салдацкіх песнях раскрывае псіхалогію сямейных адносін, акцэнтуе перамогу кахання над смерцю: «На сынку вырас зялёны явар, / А на нявестачцы белая бяроза. / Явар з бярозаю нахіліліся, / Цераз цэркаўку сашчапіліся. / От усе ж людзі падзівіліся, / Што на тым свеце палюбіліся…» [33]. У варыянце, які запісаў Р. Шырма, сын і нявестка адлюстраваны ў вобразах каліны і асіны: «Пасадзілі сыну / Чырвону каліну, / А чужой нявестцы / Горкую асіну» [34].

**Заключэнне.** Шматвяковы народны вопыт выпрацаваў даволі адладжаную самабытную сістэму маральнага выхавання, якая дазваляе правесці мяжу паміж ісцінай і фальшам, карысным і шкодным, дабрачыннасцю і заганнасцю.

Казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні з'яўляюцца мастацкім увасабленнем няпісаных народных маральна-этычных канонаў. Яны адлюстроўваюць спецыфіку сямейнага становішча казака (рэкрута, салдата) у цэлым і яго асабістыя ўчынкі. У гэтых песнях вельмі ярка выражаны прынцып сувязі выхавання з жыццём, з усімі праявамі штодзённай рэчаіснасці. У маральным выхаванні яны актыўна выкарыстоўвалі метад прыкладу, метад папярэджвання і метад-узор для пераймання. У песнях прасочваецца выхаваўчы сэнс маральных запаветаў бацькоў, абрадаў ініцыяцыі. Выхаваўчая скіраванасць казацкіх, рэкруцкіх і салдаціх песень фіксуецца і ў сюжэтах негатыўнага, трагічнага характару: сюжэт расправы, забойства мужам-салдатам нявернай (былой) жонкі; паклёп свекрыві (яе злачынствы) на нявестку; трагічная рэўнасць свекрыві — перамога кахання над смерцю.

Аналіз казацкай, рэкруцкай і салдацкай песеннай творчасці дазваляе сцвярджаць, што дадзеныя песні выконвалі важную камунікатыўную і выхаваўчую ролю, у іх цесна перапляталіся светапоглядныя, маральныя і этычныя пачаткі.

### Спіс цытуемых крыніц


1. Песні сямі вёсак: традыцыйная народная лірыка Міншчыны / уклад. Н. С. Гілевіч. Мінск : Выш. шк., 1973. 508 с.
2. Сацыяльна-бытавыя песні / уклад., сістэматызацыя тэкстаў, уступ. арт. і камент. І. К. Цішчанкі [і інш.] ; уклад. муз. часткі Г. В. Таўлай ; рэд. А. С. Фядосік. Мінск : Навука і тэхніка, 1987. 488 с. (Беларуская народная творчасць).
3. Беларускія народныя песні : у 4 т. / запіс Р. Шырмы ; рэдкал.: Н. Глебка [і інш.]. Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1960. Т. 2 : Жаночая доля, недабраная пара, хрэсьбінныя і сіроцкія ; Казацкія, рэкруцкія і салдацкія ; Батрацкія і прымацкія, песні няволі і змагання. 429 с.
4. Там жа. С. 299.
5. Песні сямі вёсак: традыцыйная народная лірыка Міншчыны. С. 142.
6. Там жа. С. 144.
7. Там жа. С. 142.
8. Там жа. С. 140.
9. Бычко-Машко И. Е. Сборник народных песен, записанных в посёлке Калюга-Комарно, Рогознянской волости, Кобринскаго уезда, Гродненской губерни. СПб. : Тип. Императ. акад. наук, 1911. 61 с.
10. Сацыяльна-бытавыя песні. С. 123.
11. Там жа. С. 123.
12. Там жа. С. 124.
13. Песні Беласточчыны / уклад. М. Гайдук ; Акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. Мінск : Беларус. навука, 1997. 367 с.
14. Там жа. С. 220.
15. Малевич С. Белорусские народные песни: Минская губерния, Слуцкий уезд. СПб. : Тип. Императ. акад. наук, 1907. 195 с.
16. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / уклад.: В. Д. Ліцвінка, Г. Р. Кутырова. Мінск : Універсітэцкае, 1995. 477 с.
17. Сацыяльна-бытавыя песні. С. 57.
18. Там жа. С. 60.
19. Там жа. С. 59.
20. Беларуская народна-паэтычная творчасць : вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ БССР / В. К. Бандарчык [і інш.] ; пад агул. рэд. М. Р. Ларчанкі. Мінск : Выш. шк., 1979. 418 с.
21. Песні Беласточчыны. С. 204.
22. Беларускі фальклор : хрэстаматыя : вучэб. дапам. для філал. спецыяльнасцей выш. навуч. устаноў / склад.: К. П. Кабашнікаў [і інш.]. Мінск : Выш. шк., 1996. 856 с.
23. Белов В. И. Лад: очерки о народной эстетике [Электронный ресурс] // Антология древнерусской литературы. М., 1989. URL: www.booksite.ru/fulltext/vas/ily/lad/index.htm (дата обращения: 03.02.2009).
24. Лірычныя песні / уклад. і рэд. Н. С. Гілевіч. Мінск : Выд-ва БДУ. 1976. 464 с.
25. Там жа. С. 59.
26. Малевич С. Белорусские народные песни: Минская губерния, Слуцкий уезд. С. 35.
27. Лірычныя песні. С. 57.


Репозиторий БарГУ

28. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць. С. 432.
29. Шейн П. В. Белорусские народные песни. СПб. : Тип. Майкова, 1874. 566 с.
30. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць. С. 428.
31. Жанчына ў беларускай народнай творчасці / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі, секцыя этнаграфіі і фальклору. Мінск : Выд-ва АН БССР, 1940. 520 с.
32. З вечнага. Зборнік фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў Случчыны / збір. Р. В. Родчанка ; Рэсп. навук.-метад. цэнтр нар. творчасці і культ.-асвет. работы. Мінск, 1984. 54 с.
33. Там жа. С. 16—17.
34. Беларускія народныя песні. С. 381.

УДК 78.03(367)

**К. Ф. Лысак**
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск*

# АСАБІСТЫЯ ЯКАСЦІ ГРАМАДЗЯНІНА Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ЭТАСЕ БЕЛАРУСАЎ

**Уводзіны.** Сённяшні час мае асаблівае значэнне для грамадзян нашай краіны, бо менавіта цяпер адбываецца актыўнае станаўленне сучаснай беларускай дзяржаўнасці. Беларусь паўстае як паўнавартасны суб’ект эканомікі, палітыкі і міжнародных адносін. Існаванне нашай суверэннай рэспублікі мае істотны сэнс для кожнага беларуса: мінулае стагоддзе дало нам магчымасць жыць ва ўласнай незалежнай дзяржаве і самастойна вырашаць свой гістарычны лёс. У беларускай інтэлектуальнай прасторы існуе меркаванне аб фарміраванні спецыфічнага тыпу нацыянальнай ідэнтыфікацыі — грамадзянскай, якая залежыць, у першую чаргу, не ад этнічных характарыстык, а ад прыналежнасці да пэўнай дзяржавы. Такая ідэнтыфікацыя вымушае фарміраваць іншы змест маральна-этычных норм, каштоўнасцей і ўстановак ва ўладна-палітычнай, сацыяльнай і культурнай сферы — гэта значыць у нацыянальным этасе. Вывучэнне дадзеных характарыстык дазволіць асэнсаваць месца і ролю асобы ў сучасным беларускім грамадстве, выявіць змест і ролю ў ім маральна-этычных рэгулятываў, разгледзець уяўленні аб ідэальным вобразе грамадзяніна ў сучаснай беларускай культуры.

**Асноўная частка.** Пасля падзей Вялікай французскай рэвалюцыі адбыліся перамены ў разуменні легітымнасці той ці іншай улады. Калі раней права асобы кіраваць было звязана з яго паходжаннем, а яго паўнамоцтвы лічыліся дадзенымі яму Богам, то пасля суб’ектам гісторыі стаў народ. Такім чынам, узаемаадносіны асобы і дзяржавы перайшлі з катэгорыі падданства ў катэгорыю грамадзянства, ад сувязі непасрэдна з манархам да сувязі з дзяржавай, якая мае выражэнне ва ўзаемных правах і абавязках. Акрамя таго, тагачасныя падзеі прывялі да пачатку стварэння сучасных нацыянальных дзяржаў. Даследчыкі вылучаюць дзве мадэлі іх канстытуявання — этнічная і грамадзянская [1, с. 20—22]. У першым выпадку прыналежнасць да дзяржавы залежыць ад этнакультурных характарыстык індывіда і ўспрымання іх як самакаштоўных. У другім выпадку вызначальнай з’яўляецца грамадзянская прыналежнасць, а далучэнне да супольнасці ажыццяўляецца добраахвотным прыняццем норм, каштоўнасцей і ўстановак агульнанацыянальнай інтэгруючай культуры. Гэта не прадугледжвае адмову ад сваёй уласнай этнічнай самаідэнтыфікацыі. Прыняцце нацыянальнай культуры азначае не толькі дэкларaванне прыналежнасці да пэўнай нацыі, але і засвойванне яе ідэалаў і каштоўнасцей, усведамленне адказнасці за яе будучыню як калектыўнага суб’екта.

Паняцце «грамадзянін» паходзіць ад грэцкага слова πολίτης, што ў перакладзе азначае «жыхар горада». У лацінскай мове сінанімічнае значэнне мае слова civilis. Ужо гісторыя правоў і абавязкаў жыхара старажытнагрэцкага поліса дазваляе вылучыць асноўную якасць грамадзяніна — права голасу. Асноўнай рысай ідэальнага грамадзяніна была яго актыўная пазіцыя ў вырашэнні дзяржаўных пытанняў і клопат пра лёс сваёй Радзімы. Таму выгнанне з поліса лічылася самым страшэнным пакараннем. Добрасумленнасць і шчодрасць асобы ў дачыненні да сваёй супольнасці — прыярытэтныя ўмовы для атрымання права голасу.

На мяжы XVIII—XIX стст. у шэрагу краін упершыню ў гісторыі замацавалася так званае канстытуцыйнае права ці дзяржаўнае права, якое знайшло сваё адлюстраванне ў пісаным законе той ці іншай дзяржавы — канстытуцыі. У ёй замацоўваліся асаблівасці дзяржаўнага ўладкавання, а таксама правы і абавязкі ва ўзаемаадносінах дзяржавы і асобы [2].

Пачатак фарміравання вобразу асобы грамадзяніна ў нацыянальным этасе беларусаў можна звязаць з пачаткам нацыябудаўнічых працэсаў, калі народ пачынае ўспрымацца як паўнавартасны і самастойны суб’ект, які мае права на самавызначэнне, выбар уласнага гістарычнага шляху. Пад нацыянальным этасам мы разумеем устойлівую сістэму каштоўнасцей, ідэалаў і норм, прынятую ў нацыянальнай супольнасці, якая фарміруецца ў працэсе камунікацыі яе прадстаўнікоў, залежыць ад гісторыка-культурных умоў і рэгулюе адносіны ва ўладна-палітычнай, сацыяльнай і культурнай сферы. Своеасаблівым маніфестам пераадолення фатальнасці лёсу, жадання мець агульначалавечыя правы і карыстацца імі, а таксама неабходнасці быць гаспадаром на сваёй зямлі стаў верш Я. Купалы «Мужык»: «Але хоць колькі жыць тут буду, / Як будзе век тут мой вялік, / Ніколі, браткі, не забуду, / Што чалавек я, хоць мужык» [3, с. 43]. Быць гаспадаром на сваёй зямлі — умова пачуцця ўласнай годнасці, павагі да сябе і прыняцця іншых. Яна і сёння з’яўляецца важным рэгулятывам у маральна-этычных каардынатах беларусаў.

© Лысак К. Ф., 2016



Рэпазіторый БарДУ